**Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей
Якуба Коласа**

# КАЛАСАВІНЫ

## ТВОРЧАЯ СПАДЧЫНА ЯКУБА КОЛАСА Ў ПАРАДЫГМЕ ГРАМАДСКА-ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ ПІСЬМЕННІКА

Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 125-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Якуба Коласа
30 кастрычніка 2007 г., Мінск



МІНСК
«Лазурак»
2008

УДК [821.161.3.09+929 Колас] (082)
ББК 83.3(4Беи)я43
К 17

Складальнікі:

дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа *З. М. Камароўская;*

намеснік дырэктара Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа *Г. І. Зайцава.*

К17 Каласавіны. Творчая спадчына Якуба Коласа ў парадыгме грамадска-інтэлектуальнага асяроддзя пісьменніка : матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 125-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Якуба Коласа, 30 кастрычніка 2007 г., Мінск / складальнікі : З. М. Камароўская, Г. І. Зайцава. — Мінск : Лазурак, 2008 — 304 с.
ISBN 978-985-6260-38-7.

Зборнік тэзісаў дакладаў і паведамленняў з'яўляецца працягам вывучэння шматграннай спадчыны народнага паэта.

УДК [821.161.3.09+929 Колас] (082)
ББК 83.3(4Беи)я43

ISBN 978-985-6260-38-7

© Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа, 2008
© Афармленне ТАА «Лазурак», 2008

Алена Ігнацюк

## ІДЭАЛЫ ФАЎСТАЎСКАГА ЧАЛАВЕКА Ў ПАЭЗІІ ЯКУБА КОЛАСА

Філасофска-эстэтычныя думкі Я. Коласа цікава назіраць-прачытваць, суадносячы іх са светапоглядам таго класічнага еўрапейца, а дакладней — «фаўстаўскага чалавека», якога запазычыў нямецкі культуролаг Освальд Шпенглер, аўтар кнігі «Закат Еўропы», для сваёй красамоўнай антыэвалюцыйнай тэорыі ў геніяльнага І. Гётэ. І як вынік нашых назіранняў — шматпланавы характар лірычнага героя ў паэзіі Я. Коласа. З аднаго боку — народны, фальклорны характар, бо, несумненна, міфапаэтыка Я. Коласа пачалася з культа: з сімвалаў-архетыпаў *(шлях, хата, поле)*, з рытуалізаваных фальклорных святаў *(замаўленне вясны, калядныя ігрышчы, жніўныя песні і інш.)*. Яна — як сімвалічнае «рэшата», праз сетку якога прасейваюцца са-

кральныя веды пра жыццё этнічнага беларуса: напрыклад, *муха-сіраціна б'ецца пад столлю ў павуціне*, а гэта азначае — быць хуткаму лету; *саломка з каласінай, выбіўшыся з стрэшкі* — кажуць пра гуменніка, сядзібнага духа, які дапамагае сушыць і малаціць збожжа; *ходзяць віхры вірам і прасяваюць снег на сіта ў бясконцай шыры* — пэўна, тут заклінанне снегу з мэтай ачышчэння прасторы.

З другога боку, лірычны герой Я. Коласа — гэта таленавіты мастак-эстэт, ідэалы якога выхаваны дзяцінствам і роднай прыродай. Ён «думкі думае ў лад», дарэчы, як і герой аўтабіяграфіі «Паэзія і праўда» І. Гётэ.

І разам з вышэй адзначаным, коласаўскі персанаж перыяду 1898—1917 гг. — выразны праўдашукальнік. У нечым ён нагадвае «фаустаўскага чалавека» О. Шпенглера. Працытуем некаторыя думкі нямецкага вучонага. О. Шпенглер піша: «Фауст первой части трагедии, этот полуночный исследователь-одиночка, вполне логично вызывает на свет Фауста второй части и нового столетия, а именно тип чисто практический, дальновидный, направленной вовне деятельности. В этом Гёте психологически предугадал всю судьбу Западной Европы. Это цивилизация вместо культуры, внешний механизм вместо внутреннего организма, интеллект как душевная окаменелость вместо самой угасшей души. Мировая столица означает космополитизм вместо родины, холодное чутьё на факты вместо благоговения перед доставшимся от предков и органически произросшим... Мировую столицу образует не народ, но масса» [6, с. 55, 411].

Аднак вернемся да Я. Коласа і яго героя, які — з душой зусім не еўрапейца з *«мировой столицы»*, а з душой чалавека вёскі — *мужыка-беларуса*. Вынесем за дужкі падрабязнага нашага разгляду публікацыі паэта 1917—1956 гг. Нас хутчэй цікавіць ранняя паэзія Я. Коласа ў дачыненні да канцэпту «заходнееўрапейская цывілізацыя», а дакладней, цікавяць пытанні: ці магчымы Я. Колас без інтэлектуальных ідэй Захаду? Як паўплываў аўтарытэт класічнага заходнееўрапейца на ментальнасць коласаўскага героя 1898—1917 гг.? Намнога пазней, у 1935 г., будучы ў Парыжы на кангрэсе пісьменнікаў свету, Я. Колас скажа: «Парыж цудоўны горад, шмат цікавейшых помнікаў і слядоў вялікай еўрапейскай культуры. Але ўсё ж для мяне, чалавека палёў і лясоў, намнога прыгажэй мая Беларусь» [3, с. 111]. Адзначым яшчэ адно назіранне паэта ў лісце ад 3. VI. 1941 г., адрасаваным А. А. Усу: «За это время я уже успел побывать в Вильно... Весь

центр асфальтирован. Конки нет, трамвая тоже, но для трамвая там нет нужного простора, так как виленские улицы узкие, тесные, кривые... Хороши окрестности города» [3, с. 230]. Як бачна, ні Парыж, ні Вільня асабліва Я. Коласа не натхнялі. А пра англійскіх палітыкаў зроблена наступная заўвага: «Яны не паддаюцца парывам сэрца. Яны, як бухгалтары, пазіраюць на лічбы. Яны не хочуць пастунацца сваімі інтарэсамі, ім выгадней заграбаць жар чужымі рукамі...» [3, с. 324].

І ўсё ж для Я. Коласа ва ўсёй яго творчасці дакастрычніцкага і паслякастрычніцкага перыядаў чалавек Захаду пераважна — гэта заваёўнік, вораг, а калі ён яшчэ і «забойца», «кат», то паэт параўноўвае яго з «каінам», у якім не можа прызнаць «брата» (верш «Ворагам», 1917 г.).

Назіраючы творчасць паэта перыяду 1910—1917 гг., разважаючы пра грані таленту аўтара вершаў «На прастор» (1915), «Вецер» (1914), «Кветкі» (1913), «З песень адзінокага» (1910), «Думкі» (1909), «Бездараж» (1909), «Перад навальніцай» (1909), «Люд стогне» (1917) і інш., — цікава разумець стаўленне беларускага песняра да менталітэту «фаустаўскага чалавека». Гэта мы сёння, пагаджаючыся з О. Шпенглерам ці, наадварот, не пагаджаючыся, называем класічнага заходнееўрапейца то *касмапалітам*, то *рэлятывістам*, то *імперыялістам*, то *глабалістам*, але ў цэлым больш захапляемся ім, яго *інтэлектам, розумам, воляй*. А як ідэалізаваў заходнееўрапейскага чалавека Я. Колас?

Прыгадаем два творы: паэму «Новая зямля» Я. Коласа і карціну «Зямля» Фердзінанда Рушчыца (1870—1936), напісаную пад уздзеяннем рэвалюцыйнага пад'ёму канца XIX — пачатку XX ст. У Ф. Рушчыца сімвалічная «зямля», акруглёна-прыўзнятая, маштабная, нібы расце да памераў бясконцага космасу. Алавяныя аблокі, нізкія і цяжкія, як камяні, пярэчаць такому росту Зямлі. І толькі фігура маленькага чалавека на баразне ўзмацняе яе рух. На першы погляд, у Я. Коласа, як і ў Ф. Рушчыца, ідэя пошуку *новай зямлі* вырастае з пазіцыі касмапалітызму — у тым сэнсе, што ідэалы лірычнага героя Я. Коласа, назавем яго *чалавекам баразны*, часам супадаюць з ідэаламі *«гражданина мира»*, але які не жыве па *правілу Гамера* (у Старажытнай Грэцыі прыкладам тэндэнцыі касмапалітызму было *правіла Гамера*, па якому самыя далёкія ад нас народы з'яўляюцца самымі шчаслівымі, а ў нас саміх — усё дрэнна). У вершах Я. Коласа дайсці да новай зямлі азначае: умець выйсці за межы *баразны* і пры гэтым не збіцца са сцежкі. Тут патрэбны «чуткія вушы», «арліныя вочы», інакш

кажучы — Розум і Воля, як у «фаустаўскага чалавека». І ўсё ж... Сімвалічны праўдашукальнік (грамадзянін свету) Я. Коласа, калі разглядаць яго ў кантэксце думак О. Шпенглера, — гэта чалавек *Культуры, а не Цывілізацыі:* яму, каб быць «волі дастойным», патрэбен «агонь у сэрцы»; ён выбірае Радзіму, патрыятызм замест касмапалітызму, жыве душой, а не механічным розумам. Працытуем некаторыя радкі вершаў перыяду 1898—1917 гг.: «Гэй, вецер разгульны! // Ты вечны дарожны // І вечны выгнаннік, бы кім закляты! // Заўсёды маркотны, заўсёды трывожны, // Спакою ніколі не ведаеш ты <...> Па кім ты спраўляеш памінкі-хаўтуры, // Ігрышчы сіл чорных, начніц, ведзьмакоў? // Ці ты раздзімаеш вялікую буру, // Сусветную буру, плач сірат, удоў?» [4, с. 325]; «Гэй, на волю, на разлогі // Смужных даляў і палёў, // Дзе ва ўсе канцы святоў // Леглі вольныя дарогі!» [4, с. 326]; «Гэй, вецер заходні! // Каго ты аганіў? // Над кім ты заплакаў? // Так жаласна ўзвыў?» [4, с. 325]; «Я — адзін, нічым не звязан, // Мне няма над чым карпець, // Свет нідзе мне не заказан, // Вольны ўсюды *я ляцець* <...> Даражэй за ўсё свабода, // Дык што плакацца дарма? // Воля, Воля! Толькі шкода, // Што цябе нідзе няма» [4, с. 193]; «Адкрыты дарогі табе, чалавеча, // На поўдзень, на захад, на ўсход. // Ты вольны, нябога, ідзі куды хочаш» [4, с. 390] і інш.

З вершаў бачна, што выконваюць *волю* героя два галоўныя сімвалы: *дарога* і *вецер*, і што лірычны герой (у абдымках гэтых сімвалаў) мае два профілі: адзін профіль — не прагматыка, чалавека зусім не фаустаўскай волі (па О. Шпенглеру), бо воля яго не можа спраўдзіцца на глебе *голаду і тугі, бездарожжа, цемры;* ён — прыніжаны мужык, не інтэлігент. Другі профіль — як у таго *класічнага заходнееўрапейца,* на твар якога паклаў *пасмяротную* маску *Фауста* вучоны О. Шпенглер: гэта профіль *чалавека цывілізацыі* з яго ідэаламі, увасобленнымі ў паняццях *характарнасць, геній, сіла.* Гэтыя ж ідэалы супадаюць з ідэаламі самога І. Гётэ перыяду «сілы і націску». Аднак такія *фаустаўскія пошукі* цалкам не задавальнялі Я. Коласа, бо яны не вельмі характэрныя для мастацтва XIX ст., калі ў модзе былі ўжо не розум, а пачуцці і жарсці. Напрыклад, з успамінаў М. Лужаніна пра гісторыю «Сымона-Музыкі» бачна, што «Фауст» асабліва Коласа не цешыў: «Чытаў і «Фауста», але, відаць, трапіла да мяне кніга не пад настрой... і не разварушыла да таго захаплення, што выклікае гэты твор» [5, с. 125].

Паназіраем больш падрабязна *культурнага чалавека* Я. Коласа у кантэксце думак І. Гётэ. Калі абагуленага лірычнага героя, праўдашукальніка XIX — пачатку XX ст., умоўна назіраць на фоне ключавых сцэн «Фауста», то мужык-беларус бачыцца не дэманам, не Мефістофелем, які ў І. Гётэ — «раўнадушная асоба», і не філосафам-ідэалістам з паэмы, тым «бакалаўрам», які думае, што «свет пачаўся толькі з яго». Прыгадаем, як Гётэ, са слоў яго сакратара Іагана Экермана, ацэньвае літаграфію аднаго французскага аўтара на матыў «Фауста». Вось як нямецкі паэт ахарактарызаваў сцэну пагоні, пасля вызвалення Грэтхен з турмы: «...Они так мчатся, что Фауст едва-едва удерживается в седле; ветер, что хлещет ему навстречу, сорвал с него шляпу... Его боязливо вопрошающий взор обращён на Мефистофеля, с напряжённым лицом он вслушивается в его слова. А тот сидит спокойно, словно некое высшее бесстрастное существо... Нет на нём ни узды, ни седла, да и к чему бы, он мчится и так... Стихии ветра для него не существует...» [7, с. 183].

*Стыхія сустрэчнага ветру* — вось што збліжае героя Я. Коласа з Фаустам — з тою незвычайнаю асобаю, у якой увасоблены, як піша літаратуразнаўца Аляксандр Анікст, «энтузіазм, памкненне да высокіх мэтаў» [1, с. 75]. Аднак, калі Фауст глядзіць на свет вачыма Мефістофеля, які носьбіт *поўнага адмаўлення жыццёвых каштоўнасцей*, то сутыкаецца з *незадаволенасцю сабою, светам*, асабліва гэта бачна ў другой частцы паэмы. Незадаволенасць ёсць несупакоенасць — як неад'емная рыса характару Фауста. Невыпадкова ў пяты акт другой часткі паэмы ўключаны эпізод з *Філімонам і Бавкідай* — героямі антычнага падання («верныя муж і жонка пражылі ў поўнай згодзе на прыбярэжным грудку доўгае жыццё» [2, с. 510]). А што ж Фауст? Яго не спакусіць каштоўнасцямі цывілізацыі, горада. І мара яго, на першы погляд, простая: *ён бачыць калябярэжны край... і хоча адваяваць яго* ў мора. Фауст — чалавек культурны? Але калі ён пачаў перастварацьпрыроду, то падпаліў хаціну старых на грудку. Так! Ён не супраць набегаў мора на зямлю. *Але ён і не супраць таго, што яму не належыць. Можа з гэтай філасофскай ісціны ў Гётэ* (паралельна — і ў Шпенглера, а таксама і ў А. Анікста) пачынаецца адлік *вялікага фаустаўскага пачатку*, перададзенага праз памкненне героя да *заваёваў бясконцасці*, ці наадварот — *да бясконцых заваёваў, — быццам гэта не для Мефістофеля*, а для яго, фаустаўскага еўрапейца, што ў кнізе О. Шпенглера, падрыхтавана наступная характарыстыка: «Да и не нужны ему ни-

какие кони — одной его воли достаточно, чтобы перенестись с места на место с любой быстротою. А скачет он верхом, так как надо, чтобы его видели скачущим...» [7, с. 183].

У сэнсе адчування Радзімы, уласнасці, спадчыны коласаўскі персанаж хутчэй *антыфауст. Ліпы, хаціны і званочкі Фаусту не належаць*. Вось як перадае Экерман гэтую думку Гётэ: «*Потом мы заговорили о Фаусте; даже в старости он не избавился от прирождённой черты характера — недовольства. Владея всеми сокровищами мира в им самим созданном государстве, он не знает покоя из-за двух лип, хижины и колокольчика, ему не принадлежащих*» [7, с. 439]. Але мы скажам, што такія сімвалічныя ліпы, хаціна і званочкі хутчэй даспадобы герою Я. Коласа, у тым сэнсе, што па характару ён — не зусім заваёўнік, яму чужога не трэба. Таму ён ідзе па жыцці з адчуваннем пераадольвання жыццёвых выпрабаванняў, сумненняў больш радасна ў параўнанні з Фаустам.

Герой Я. Коласа ў душы паэт, эстэт, які абыходзіцца са сваімі бачаннямі-пачуццямі, нібы рэстаўратар-жывапісец; ён разумее: «Той, хто стварыў наша жыццё, — найвялікшы пісьменнік, майстар самага займальнага сюжэта, інтрыгі ў ходзе развіцця жыццёвых падзей. Перагортваеш адну займальную старонку нашай жыццёвай эпапеі і з напружанай увагай пераходзіш на другую — так далей... І застаецца тое ж пякучае пытанне: ну, а што далей? Вось у гэтым і ўвесь сакрэт нашай прыхільнасці да жыцця» [3, с. 479]. Бачна, што святло жыццёвых загадак і таямніц вядзе фантазію Я. Коласа-мастака да перасатварэння рэальных вобразаў у прывіды: «Усё змяшчаецца ў тумане, // Ў белым попеле снягоў» [4, с. 144], «Ды вясна мая туманіцца» [4, с. 29], «Што ж вочы мне туманяцца, // Туманяцца слязой!» [4, с. 201], «Змые дожджык твар зямлі!» [4, с. 397] і інш. Тут зліты ява і сон, памяць і забыццё. І гэта наводзіць нас на перакананне: у паэзіі Я. Коласа, асабліва дарэвалюцыйнага перыяду, катэгорыя памяці — гэта свайго роду абазначэнне бяспамяцтва, а гады ліхалецця — тая ж *Вальпургіева ноч*, што і ў І. Гётэ, якая злучана *з антычным законам прыгажосці*. І ў выніку ствараецца ўражанне вечнага кругавароту быцця, дзіўных метамарфозаў, узнікае адчуванне злучанасці варварскага і гуманістычнага пачаткаў. У паэме Гётэ антычнасць пачынаецца са сну пра Леду, са сцэн з'яўлення Парыса і Елены. У эстэтыцы Коласа замест Вальпургіевай ночы — Вераб'іная ноч як сімвал смуты; замест багіні Елены — мы бачым сімвалічную жанчыну. Яна розная: кветка-настаўніца, настаўніца-

будучыня, жонка-Радзіма. У вершы «Вераб'іная ноч» (1914 г.) *пажар* сімвалічнай ночы нібы сам спальвае сябе: *пажар паліць змрочную смугу*, у выніку — родзіцца цішыня:

І вось неба не ўтрывала,
Ўсё ў агнях запалыхала,
Мрок хістаецца, дрыжыць.
Там гарацць, як у пажары,
На паўдні, на ўсходзе хмары,
Дзе зліліся рубяжы.
<...>
Ўскіне вочы агнявыя,
Ўскіне грозна і закрые,
Цьму сярдзіта ўскалыхне,
Ды як сыпне ў неба жарам!
Страшны шлях асвеціць хмарам,
Ніжай мрок зямлі прыгне.
А зямля маўчыць трывожна.
Лес пакорна і набожна
Сціх, чакае — ні гу-гу!..

Сціхне «Вераб'іная ноч» — і пачнецца ўсё *спачатку:* народзіцца НОВАЯ ЗЯМЛЯ, а з ёю — і новы чалавек... Чалавек культурны... І ён для еўрапейскага інтэлекту пачатку XX ст. нейкі нязвыклы, другі... У Коласа ён — не *Фауст* і не зусім сярмяжны *мужык*. Ён — Вецер з апавядання «Пад новы год» — сапраўдны дух народнай нацыянальнай мудрасці. Дух Ветру, які вядзе свайго вандроўніка ад антычнай Елены да Ганны. Па сцежкахкладачках... У будучае...

## Літаратура


1. *Аникст А.* Гёте и Фауст: От замысла к свершению. М.: Книга, 1983.
2. *Гёте І. В.* Фауст / Пер. Б. Пастернака. Собр. соч.: В 10-ти томах. Т. 2. М., 1976.
3. *Колас Я.* Збор твораў у чатырнаццi тамах. Том 13. Пісьмы 1908—1949 гг. Мн., «Маст. літ», 1977.
4. *Колас Я.* Збор твораў у чатырнаццi тамах. Том 1. Вершы 1898—1917 гг. Мн., «Маст. літ», 1977.
5. *Лужанін М.* Колас расказвае пра сябе: Аповесць-эсэ. Мн.: Маст. літ., 1982.
6. *Шпенглер Освальд.* Закат Европы. Том первый. М.: «Айрис-пресс», 2003.
7. *Эккерман И. П.* Разговоры с Гёте. / Пер. с нем. Н. Ман. М.: Худож. лит., 1981.

## ЗМЕСТ

*Камароўская З. М.* Прывітальнае слова да гасцей і ўдзельнікаў канферэнцыі «Каласавіны-2007» . . . . . . . . . . . . . . 3
*Калеснік В. Л.* «Неси до людей всі думки, почуття і слово твоє не згорить і не згасне...» (Вітальне слово на святі «Каласавіни» з нагоди 125-чя від дня народження Якуба Коласа) 5
*Мушынскі М. І.* Якуб Колас — асоба, пісьменнік, грамадскі дзеяч ва ўспрыманні Данілы і Міхася Міцкевічаў . . 7
*Тычына М. А.* Купалаўска-коласаўская праграма сацыякультурнай адбудовы Беларусі і яе рэалізацыя ў сучасных умовах . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 19
*Максімовіч В. А.* Класічная літаратурная традыцыя і сучаснасць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29
*Жураўлёў В. П.* Чалавек у сілавым полі самадэтэрмінізму і знешніх уплываў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 34
*Бароўка В. Ю.* Беларускія пісьменнікі XIX стагоддзя ў ацэнцы Якуба Коласа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 42
*Клімуць Я. І.* Якуб Колас і Міхась Лынькоў: жыццёвыя і творчыя стасункі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 47
*Міцкевіч В. Д.* Ліст Веньяміна Каверына да Якуба Коласа: з асабістага архіва песняра . . . . . . . . . . . . . . . . . 52
*Гарон А. М.* Далёкі голас (Перапіска Якуба Коласа і Уладзіслава Чаржынскага) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
*Казлова В. В.* Эпісталярная спадчына Якуба Коласа перыяду Вялікай Айчыннай вайны . . . . . . . . . . . . . . . 60
*Трус М. В.* Якуб Колас — дэлегат Парыжскага кангрэса 1935 года . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
*Марціновіч Д. А.* Якуб Колас і Вільгельм Кнорын . . . . . 76
*Шыракава Я. І.* Наследаванне хрысціянскіх традыцый сям'і Міцкевічаў у жыцці і творчасці Якуба Коласа . . . . . 83
*Валахановіч А. І.* «Выдатны рэвалюцыянер, адзін з лепшых маіх сяброў...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 92
*Назараў В. Ф.* Дапаўненні, замены і скарачэнні ў некаторых пасляваенных артыкулах Якуба Коласа . . . . . . . . . . 98

*Шаладонаў І. М.* Самаідэнтыфікацыя чалавека і народа ў ранняй прозе Якуба Коласа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 104
*Камкоў П. М.* Выяўленне вайны ў драматургіі Якуба Коласа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 112
*Драздова З. У.* Праблема смерці і вечнага жыцця ў творчасці Якуба Коласа і Міхаіла Шолахава . . . . . . . . . . . . . . 114
*Корань В. А.* Асобы з акружэння Якуба Коласа: Алесь Звонак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 125
*Канапацкая Т. В.* Перакладчык «Слова...» — на сцяжынках Якуба Коласа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 130
*Ильин А. Л.* Якуб Колас как свидетель и участник культурно-просветительской жизни Пинска перед Первой мировой войной . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 133
*Ненадавец А. М.* Эстэтычнае значэнне «Казак жыцця» Якуба Коласа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 137
*Шаладонава Ж. С.* Паэтычная «формула» дзяржаўнасці ў творах Якуба Коласа і Тараса Шаўчэнкі . . . . . . . . . . . . . 140
*Конан У. М.* Эстэтыка паэмы «Новая зямля» ў кантэксце нацыянальнага адраджэння . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 147
*Адамовіч Г. Я.* «Ад роднае зямлі...» да «Вы зноў са мною...»: вопыт тыпалагічнага супастаўлення вобразаў Якуба Коласа і Іагана Вольфганга Гётэ . . . . . . . . . . . . . . 156
*Ігнацюк А. У.* Ідэалы фаўстаўскага чалавека ў паэзіі Якуба Коласа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 165
*Люкевіч В. В.* Хранатоп турмы ў раманах Якуба Коласа і Івана Буніна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 172
*Белакурскі В. М.* Народная мудрасць як аснова філасофскага светапогляду Якуба Коласа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 177
*Венско В. І.* Хрысціянскае светаўспрыманне Якуба Коласа 181
*Малашук І. М.* Міфалагічна-фальклорныя матывы ў творчасці Якуба Коласа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 184
*Гараднвіцкі Я. А.* Экзістэнцыйныя матывы ў трылогіі Якуба Коласа «На ростанях» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 188
*Казыра К. А.* Аб напісанні і перапрацоўках апавядання Якуба Коласа «Адгукнуўся» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 195
*Золава Э. А.* Да праблемы выбару асноўнага тэксту паэмы Якуба Коласа «Новая зямля» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 198
*Шамякіна А. І.* Помнікі народнай памяці ў трылогіі Якуба Коласа «На ростанях» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 203
*Вабішчэвіч Т. І.* «Эпічны» беларус у лірыцы Якуба Коласа «нашаніўскай» пары (да праблемы нацыянальнага характару) 206

*Бадзевіч З. І., Трайкоўская В. П.* Варыянтнасць фразем у мове твораў Якуба Коласа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 215
*Пяткевіч А. М.* Маршрутамі Якуба Коласа: тапонімы наваколля Новага Свержня . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 219
*Чабатар Н. А.* Назоўнікі з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі ў мове твораў Якуба Коласа і Янкі Купалы . . . . . . . . . . 223
*Данільчык З. П.* З назіранняў над мовай эпісталярнай спадчыны Якуба Коласа перыяду Вялікай Айчыннай вайны 229
*Белакурская Ж. Я.* Ранняя творчасць Якуба Коласа як сімвал нацыянальнага Адраджэння . . . . . . . . . . . . . . . . . . 232
*Акаловіч Л. А.* Царкоўная лексіка ў паэме Якуба Коласа «Сымон-музыка» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 239
*Чарнаброўкіна Н. У.* Традыцыі Якуба Коласа ў сучаснай паэтычнай словатворчасці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 265
*Выхота В. А.* «А на стале тым — рай, дый годзе...» (тыпалагічнае супастаўленне беларуска-нямецкай лексікі ў паэме Якуба Коласа «Новая зямля») . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 268
*Курцова В. М.* Якуб Колас: прынцыпы правапісу беларускай мовы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 275
*Сачанка С. Б.* Устойлівыя параўнанні ў мове паэмы Якуба Коласа «Новая зямля» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 286
*Камароўская Л. В.* Вобразы жыхароў вёскі Мікалаеўшчына ў апавяданні Якуба Коласа «Наша сяло, людзі і што робіцца ў сяле» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 292
Звесткі пра аўтараў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 296